**А. Г. Цымбал**

# БЕЛАРУСКАЕ ПЫТАННЕ Ў ГІСТАРЫЧНА-ПАЛІТЫЧНЫМ ДЫСКУРСЕ ПОЛЬСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ Ў ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX ст.[1]

Вывучэнне польскімі гісторыкамі беларускага пытання, перспектыў нацыябудаўніцтва і стварэння ўласнай дзяржаўнасці пачалося яшчэ ў пачатку XX ст. Гэты перыяд характарызаваўся шчыльнай сувяззю публікацый па нацыянальнай праблематыцы з грамадска-палітычным жыццём. Часта аўтары з’яўляліся не толькі навукоўцамі, але і актыўнымі дзяржаўнымі дзеячамі, прадстаўнікамі палітычных партый і рухаў. Даследаванні беларускага пытання адрознівала невялікая адлегласць па часе ад непасрэдных падзей і працэсаў, якія вывучаліся. Закладзеныя ў першай трэці XX ст. традыцыі вывучэння і інтэрпрэтацыі беларускай праблемы знайшлі свой працяг у пазнейшыя часы. Акрамя ацэнкі польскімі навукоўцамі і палітычнымі дзеячамі нацыябудаўнічага праекта беларусаў, нас цікавіць менавіта сувязь гісторыі і палітыкі, якім чынам гістарычная аргументацыя выкарыстоўвалася для палітычных праграм дзеянняў, абгрунтавання слушнасці тых ці іншых палітычных канцэпцый. З другога боку гістарычны наратыў знаходзіўся ў цеснай сувязі з палітычнай афіліяцыяй аўтараў, што ставіць пытанне аб іх ўзаемнай абумоўленасці.

Вялікі ўплыў на інтэрпрэтацыю праблемы мела палітыка польскай дзяржавы і канцэпцыі ўсходняй палітыкі Польшчы, якія рэпрэзентавалі розныя палітычныя сілы. Польскія нацыянальныя дэмакраты прадстаўлялі ідэю інкарпарацыі тэрыторый, што ўваходзілі раней у склад Рэчы Паспалітай. Іх лідар Р. Дмоўскі сцвяржаў, што ў беларусаў няма перспектыў стварэння ўласнай нацыі і дзяржавы. Прызнаючы некаторыя культурныя адрозненні, ён абгрунтоўваў польскую цывілізацыйную місію на ўсходзе ў сэнсе далучэння мясцовага насельніцва да польскай мовы і культуры. Гістарычная аргументацыя тут праяўлялася ў звароце да гісторыі Рэчы Паспалітай і акцэнце на паліназіцыйныя працэсы сярод шляхты ВКЛ [1, s. 66, 114], што па аналогіі павінна было падкрэсліваць і польскую місію на беларускіх землях і ў XX ст.

Трэба адзначыць, што традыцыя звароту да спадчыны Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай з’яўлялася агульнай для розных палітычных сіл міжваеннай Польшчы. Але ў гістарычна-палітычным дыскурсе інструменталізацыя гісторыі прыводзіла да розных высноў.

Польская сацыялістычная партыя, у адрозненне ад нацыянальных дэмакратаў, вітала беларускія імкненні да эмансіпацыі. Іх праграма накіраваная на стварэнне «самастойнай дэмакратычнай Рэчы Паспалітай» сцвярджала аб неабходнасці ўвядзення роўных правоў для ўсіх народаў, якія ўвайдуць

[1] Даследаванне выканана пры падтрымцы БРФФД у рамках навуковага праекта Г20Р-011.

у склад дзяржавы. Калі нацыянальныя дэмакраты сцвярджалі аб неабходнасці пабудовы мононацыянальнай унітарнай дзяржавы, то сацыялісты абгрунтоўвалі неабходнасць федэратыўнага ладу. Гісторыя Рэчы Паспалітай і польскі культурны ўплыў на землях былога ВКЛ разам з гаспадарчымі сувязямі павінны былі абгрунтоўваць імкненне адсунуць граніцу далей на ўсход з мэтай аслаблення Расійскай імперыі. Сцвярджалася, што палякі на гэтых тэрыторыях складаюць толькі частку насельніцтва і таму павінны шукаць паразумення з прадстаўнікамі іншых народаў для вырашэння лёсу агульнай айчыны [2, s. 107–108].

Ідэю федэрацыі, пабудаванай на спадчыне Рэчы Паспалітай пасля расколу партыі, падтрымлівала ППС-Левіца. Між іншым гучалі прапановы стварэння Злучаных Штатаў Усходняй Еўропы. Дзеячы ППС-Фракцыі, як Ю. Дабмроўскі, выказваліся за стварэнне федэрацыі разам з Вялікім Княствам Літоўскім і Курляндыяй. За аднаўленне Польшчы ў граніцах 1772 г. выступаў Э. Абрамоўскі ў распрацаванай праграме Саюзу Польскіх Рыцараў, які падкрэсліваў, што мэтай Саюза з'яўляецца стварэнне незалежных Польшчы, Літвы і Беларусі, вольныя і роўныя народы якіх будуць мець агульную айчыну ў граніцах да падзелаў Рэчы Паспалітай.

Лютаўскія пераўтварэнні 1917 г. ў Расіі ўзмацнілі федэратыўныя погляды польскіх сацыялістаў. У пастанове партыйнага з'езда ад верасня 1918 г. сцвярджалася аб неабходнасці ўстанаўлення граніц з апорай на права народаў да самавызначэння, лёс зямель былога Вялікага Княства Літоўскага павінен быў вызначацца воляй народаў гэтых тэрыторый. У той жа час перспектывы беларускага нацыябудаўніцтва ацэньваліся хутчэй негатыўна. Рэзалюцыю І Усебеларускага з'езда аб неабходнасці стварэння незалежнай Беларусі польскія сацыялісты разглядалі як немагчымую да рэалізацыі. У Маніфесце Часовага ўрада да польскага насельніцтва гучалі заклікі да польскага насельніцтва аб аб'яднанні з беларусамі і літоўцамі з мэтай адбудовы гістарычнай Літоўскай дзяржавы ў яе гістарычных граніцах з захаваннем сувязі з Польшчай [2, s. 110].

Маніфест ППС ад сакавіка 1918 г. адносна міжнароднай палітыкі зноў дэкларуваў права Беларусі на незалежнасць, адначасова асуджаючы польскі анэксіянізм і сцвярджаючы пажаданасць сувязі з Польшчай. Падчас польска-савецкай вайны сацыялісты ў цэлым падтрымлівалі акцыю Ю. Пілсудскага ў красавіку 1919 г.

Найбольш дэталёва погляды польскіх сацыялістаў раскрываюць публікацыі дзеячаў ППС. Адным з найбольш вядомых членаў партыі, блізкім супрацоўнікам Ю. Пілсудскага быў Леон Васілеўскі, які адначасова з'яўляўся і навуковым спецыялістам па нацыянальных меншасцях. Яшчэ ў пачатку ХХ ст. ён падкрэсліваў, што тэрыторыю гістарычнай Літвы пераважна засяляюць беларусы. У яго гістарычным наратыве Беларусь прадстаўляецца дзяржавай,

у якой беларуская мова была мовай арыстакратыі, беларушчына гучала ў дварах Ягелонаў, ёй быў напісаны Літоўскі Статут. Вялікія князі літоўскія хоць і былі літоўцамі, але цалкам трапілі пад цывілізацыйны і народны ўплыў беларускага славянскага насельніцтва ВКЛ. На думку Васілеўскага, ні Крэўская, ні Люблінская ўніі не ліквідавалі самастойнасці ВКЛ, тым не менш, польскі ўплыў значна пашырыўся ў Літве пасля стварэння Рэчы Паспалітай. І толькі пасля падзелаў сувязь Літвы і Польшчы стала яшчэ больш моцнай, чым у часы незалежнасці. Характэрна, што ўжо менавіта пасля далучэння да Расійскай імперыі польскасць тут атрымала найбольшае пашырэнне. Барацьба з польскім уплывам пачалася толькі пасля паўстання 1830–1831 гг. Падаўленне другога паўстання 1863–1864 гг. стала пачаткам расійкай палітыкі па поўнаму вынішчэнню польскасці на землях Беларусі [3, s. 5–6, 21–22]. У інтэрпрэтацыі Васілеўскага гісторыя беларускіх зямель перыяду ВКЛ набліжаецца да сучаснай «беларускай» канцэпцыі дзяржавы, якую ён называе Літвой, але падкрэслівае значнасць беларускага ўплыву. Гісторыя Беларусі ў Васілеўскага губляе кантынуітэт у выніку страты дзяржаўнасці ВКЛ, падзелаў Рэчы Паспалітай і палінізацыі эліт, што абумоўлівае яго ацэнку перспектыў беларускага руху ў пачатку XX ст. як вельмі слабых. Аргументамі пацвярджэння гэтай тэзы былі: адсутнасць беларускай інтэлігенцыі і літаратуры, малалікасць беларускіх школ, слабасць беларускіх палітычных партый і пры нізкім узроўні іх падтрымкі беларускім сялянскім насельніцтвам [3, s. 72]. На гэтай аснове ён рабіў вывад аб тым, што беларускі рух ніколі не атрымае шырокага развіцця і не знойдзе прызнання. У выніку, паводле Васілеўскага, да новай польскай дзяржавы павінна была належыць каталіцкая частка Беларусі, якая захавала польскія традыцыі.

Васілеўскі выказваўся падобным чынам адносна актывізацыі беларускага руху ў гады Першай сусветнай вайны, не звяртаючы асаблівай увагі на гістарычны кантэкст, хаця да гэтага, згадваючы падзеі рэвалюцыі 1905–1907 гг. сцвярджаў, што беларусы праявілі незвычайную актыўнасць і беларускі рух ад стану амаль неіснавання перайшоў да такіх далёкаідучых патрабаванняў [4, s. 279].

У 1920-я гг. пасля Рыжскага міру і далучэння Заходняй Беларусі да Польшчы Васілеўскі не так негатыўна ацэньваў беларускі нацыятворчы патэнцыял. Ён пісаў аб неабходнасці ўлічваць існаванне вялікай колькасці беларусаў у Польшчы, на погляды якіх значны уплыў аказвае існаванне беларускай савецкай рэспублікі. Задачай польскай дзяржавы, на яго думку, павінна было быць задавальненне ўсіх патрэб нацыянальных меншасцей праз стварэнне тэрытарыяльнай аўтаноміі для беларусаў, забеспячэнне выкарыстання беларускай мовы ў праваслаўнай царкве і школьнай адукацыі [5, s. 72].

Блізкіх поглядаў быў Тадэўш Галуўка, сацыяліст з акружэння Ю. Пілсудскага, які таксама прытрымліваўся канцэпцыі федэратыўнага ладу адроджанай Польшчы. У сваіх працах ён абгрунтоўваў ідэю стварэння дзяржавы

на ўзор Рэчы Паспалітай, якая паўстала на падставе Люблінскай уніі 1569 г. На яго думку, гэта дзяржава не толькі адрознівалася вялікімі памерамі, але і талерантнасцю да сваіх грамадзян. У той жа час ён разумеў, што ў свядомасці насельніцтва пасля падзелаў Рэчы Паспалітай адбыліся істотныя змены і зараз да незалежнасці імкнуцца ўжо не толькі палякі, але і беларусы, але пагрозай для самастойнасці гэтых народаў з'яўляюцца больш моцныя суседзі – Германія і Расія. Таму выхад Галуўка бачыў толькі ў супрацоўніцтве ўсіх народаў, якія змагаюцца за свабоду. Незалежнасць Польшчы немагчыма без незалежнасці Літвы, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі, Украіны і Беларусі, сцвярджаў ён [6, s. 94–95]. Разам з тым у сваёй публікацыі аб адносінах польскай дзяржавы да суседзей лічыў, што беларусы ў значнай ступені захоўваюць рысы пасіўнай этнаграфічнай масы, а палякі на ўсходзе з'яўляюцца найбольш культурным і дзяржаватворчым элементам [7, s. 11]. Федэрацыя з Польшчай павінна была ўяўляць паратунак для «буферных» народаў, як ён называў у тым ліку беларусаў, якія не маглі самастойна функцыянаваць. На думку Галуўка, калі застануцца сам на сам, то знікнуць на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў.

Падчас польска-савецкай вайны, калі польскімі войскамі быў заняты Мінск, Галуўка прапаноўваў стварыць Нацыянальную раду, якая павінна была б выказацца аб будучыні беларускіх зямель. Калі б яна выказалася за незалежнасць, то Польшча павінна была б прызнаць яе і ў склад Беларусі ўвайшлі б тэрыторыі Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў або пераважна землі з праваслаўным насельніцтвам. Усходняя граніца дзяржавы павінна была б знаходзіцца на мяжы 1772 г. [2, s. 116].

Пасля заключэння Рыжскага міру, аналізуючы нацыянальнае пытанне ў Польшчы, Галуўка папярэджваў аб недапушчальнасці палітыкі паланізацыі нацыянальных меншасцей, бо яна выклікае толькі нянавісць да польскай культуры і народа. Будучыню добрых адносін палякаў з беларусамі ён бачыў праз палітыку садзеяння развіццю беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці. У выпадку, калі б незалежная беларуская дзяржава паўстала, лічыў, што існаваць яна магла б толькі з апорай на Польшчу, з якой павінна мець саюзныя адносіны або нават унію. У рамках міжваеннай польскай дзяржавы Галуўка абгрунтоўваў неабходнасць аўтаноміі для беларусаў або ваяводскага самакіравання на пачатковым этапе, з самастойнасцю праваслаўнай царквы і ўлікам інтарэсаў беларускага насельніцтва ў сферы адукацыі [8, s. 34–37].

Такім чынам, гістарычна-палітычны дыскурс польскіх сацыялістаў адлюстроўваў іншы падыход да асэнсавання гістарычнай спадчыны і вырашэння беларускага пытання ў параўнанні з нацыянальна-дэмакратычным лагерам. Аднаўленне польскай дзяржавы падштурхнула да асэнсавання ўзаемаадносін з суседнімі народамі з улікам іх нацыя- і дзяржаватворчых працэсаў. Для Польскай сацыялістычнай партыі было ўласціва паслядоўнае адстойванне

федэратыўных пачаткаў арганізацыі дзяржаўнага ладу. У саюз з Польшчай павінны былі ўвайсці і беларусы, але іх здольнасць да стварэння самастойнай дзяржавы і нацыі лічылася малаверагоднай. Беларусы разглядаліся ў якасці этнаграфічнай масы, без дакладна акрэсленай ідэнтычнасці. У гэтым сцвярджэнні польскія сацыялісты прынцыпова не адрозніваліся ад нацыянальных дэмакратаў, але высновы рабіліся прынцыпова іншыя. У адрозненне ад патрабавання асіміляцыі і паланізацыі беларускага насельніцтва і тэрыторый, што вылучалі эндэкі, сацыялісты, наадварот, прапаноўвалі падтрымліваць і развіваць беларускую нацыянальную самасвядомасць з мэтай заваявання прыхільнасці беларускага насельніцтва і ў выпадку паўстання незалежнай беларускай дзяржавы, забеспячэння саюзных адносін Беларусі і Польшчы. З такім падыходам ідэя польскай цывілізацыйнай місіі на ўсходзе набывала новае гучанне, пэўныя элементы якой мы можам знайсці ў канцэпцыі УЛБ Гедройца-Мерашэўскага.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Dmowski, R.* Myśli nowoczesnego Polaka / R. Dmowski. – Warszawa : Wydaw. Zachodnie, 1934. – 116 s.
2. *Gomółka K.* Kwestia białoruska w programie PPS w latach 1918–1919 / K. Gomółka // Studia polsko – litewsko – białoruskie. – Warszawa : PWN, 1988. – S. 107-126.
3. *Wasilewski, L.* Litwa i jej ludy / L. Wasilewski. – Warszawa : [s.n.], 1907. – 77 s.
4. *Wasilewski, L.* Litwa i Białoruś. Przeszłość – teraźniejszość – tendencje rozwojowe / L. Wasilewski. – Kraków : “Książka”, 1912. – 361 s.
5. *Wasilewski, L.* Sprawa kresów i mniejszości narodowych w Polsce / L. Wasilewski. – Warszawa : “Głos Prawdy”, 1927. – S. 77–83.
6. *Werschler, I.* Tadeusz Hołówko (1889–1931) – polityk zapomniany / I. Werschler // Nowy Prometeusz. – 2011. – № 1. – S. 93–99.
7. *Hołówko, T.* Stosunek Państwa Polskiego do jego sąsiadów / T. Hołówko // Przedświt. – 1919. – № 1–2. – S. 7–14.
8. *Hołówko, T.* Kwestja narodowościowa w Polsce / T. Hołówko. – Warszawa : nakł. Księgarnii Robotniczej, 1922. – 72 s.